**Акулёнак, Л**. Прызнанне салдацкай мужнасці / Л. Акулёнак // Зара (Бешанковічы). — 2004. — 13 лют. — С. 1.

## ПРЫЗНАННЕ САЛДАЦКАЙ МУЖНАСЦІ

Мала хто ведае, што начальнік УКП ЖКГ «Бешанковіцкі камунальнік» Сяргей Міхайлавіч Аўчыннікаў – воін-інтэрнацыяналіст. Што ён у саставе групоўкі савецкіх войск служыў у Афганістане, за праяўленую мужнасць узнагароджаны медалём «За адвагу», неаднаразова заахвочваўся камандаваннем.

...Хутка праляцелі шэсць месяцаў службы ў вучэбным падраздзяленні паблізу Масквы. Тут Сяргею Аўчыннікаву прысвоілі званне малодшага сяржанта. Наперадзе чакала служба на новым месцы.

Дзе яно будзе? Думкі аб гэтым не пакідалі воіна. А ўжо праз тыдзень усё стала ясна.

На зборным пункце ішло фарміраванне батальёна спецыяльнага прызначэння. На пасаду намесніка камандзіра аднаго з узводаў быў прызначаны Сяргей Аўчыннікаў. Праз некалькі дзён падраздзяленне накіравалі ў Афганістан.

Аўтамабільная магістраль Кабул–Джалалабад – важнейшая жыццёвая артэрыя гэтай краіны. Па ёй ішлі караваны з палівам і харчаваннем, іншымі народнагаспадарчымі і ваеннымі грузамі, Ахоўваць гэту магістраль ад нападзення душманаў і прыбыло падраздзяленне.

Адразу занялі вызначаныя пазіцыі, пачалі знаёміцца з мясцовасцю. Але спакойнае жыццё працягвалася нядоўга. Ужо праз дзень на аб'ект было зроблена нападзенне. У далейшым душманы «непакоілі» амаль праз дзень.

У баях маладыя воіны аказвалі ворагу належнае супраціўленне. І з кожным днём удасканальвалі майстэрства барацьбы з ім.

Часта падраздзяленне папярэджвала плануемыя душманамі нападзенні на калоны, рабіла засады на горных сцяжынах.

У адным з баёў была разбіта вялікая група ворагаў. За правядзенне гэтай аперацыі многіх яе ўдзеяьнікаў адзначылі ўрадавымі ўзнагародамі. Сярод іх быў і Сяргей Аўчыннікаў. Медаль «За адвагу», як прызнанне салдацкай мужнасці, заззяла на яго грудзях.

У такіх напружаных і небяспечных буднях праляцеў год службы на тэрыторыі Афганістана старшага сяржанта.

Дэмабілізаваўшыся з Узброеных Сіл, ён вярнуўся дадому, у Бешанковічы.

Працаваў майстрам і прарабам на будаўніцтве, інжынерам, начальнікам упраўлення капітальнага будаўніцтва райвыканкама.

Апошнія чатыры гады Сяргей Міхайлавіч узначальвае значна большае падраздзяленне, чым у арміі. У жыллёва-камунальнай гаспадарцы працуе сёння амаль 250 чалавек. Абслугоўваюць яны сто тысяч квадратных метраў жылля, дзевяць кацельняў і дзве лазні, дарогі, тратуары Бешанковіч.

У летні час камунгасаўцы праводзяць вялікую работу па добраўпарадкаванню паркаў, кветнікаў у райцэнтры, убіраюць смецце.

З усімі пастаўленымі задачамі вытворчае падраздзяленне, якое ўзначальвае былы воін-інтэрнацыяналіст, спраўляецца паспяхова. І ў гэтым вялікая заслуга кіраўніка.

**Л. Акулёнак**